✓**16 сакавіка** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Шэсць стагоддзяў гісторыі медыцыны і фармацыі ў рарытэтах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»**, прымеркаваная да 100-годдзя ўтварэння РУП «Белфармацыя». У экспазіцыі прадстаўлены выданні, што распавядаюць аб багатай гісторыі зараджэння і развіцця медыцыны і аптэчнай справы ў Беларусі. Яны размеркаваны па раздзелах «Медыцына», «Аптэчная справа», «Вучэнне аб леках», «Лекавыя расліны». Адным з самых старажытных экспанатаў выставы з'яўляецца «Гербарый», які надрукаваў Петэр Шофер у Майнцы ў 1484 г. У кнізе апісаны і праілюстраваны 150 раслін. Гравюры (на дрэве) расфарбаваны ад рукі зялёным, жоўтым, чырвоным і сінім колерамі. Асабліва значным выданнем па медыцыне з'яўляецца «Салернскі кодэкс здароўя». У ім аўтар, іспанскі медык і алхімік Арнольд з Вілановы, прадставіў у вершах медыцынскае крэда Салернскай школы ў галіне правільнага харчавання і прадухілення захворванняў. Вялікую цікавасць для наведвальнікаў уяўляюць кнігі, што адлюстроўваюць развіццё аптэчнай справы ў розныя гістарычныя перыяды. Выданні раскрываюць медыцынскае і аптэчнае мастацтва, накіраванае на захаванне здароўя людзей.

Выстава будзе працаваць да 30 красавіка.